# АСОБА ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ Ў МАСТАЦКІМ І НАВУКОВЫМ АСВЯТЛЕННІ

**Бабровіч В.Д.**

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

Тэма асэнсавання гісторыі заўсёды займала важнае месца ў сусветнй мастацкай літаратуры і станавілася асабліва актуальнай у пераломныя моманты развіцця грамадства. У 1990-я гады, у час нацыянальнага адраджэння, узмацнілася цікавасць да гістарычнага мінулага Беларусі і, як вынік, з'явілася вялікая колькасць гісторыка-мастацкіх твораў. У ХХ стагоддзі ў драматургіі гістарычная тэматыка дасягнула найбольшага росквіту. Грамадства зацікаўлена ў наяўнасці мастацкіх твораў пра мінулае, адчуваецца неабходнасць абудзіць цікавасць да гісторыі сваёй краіны.

Як сцвярджае даследчык Ф.Драбеня, што "драматургі на мяжы ХХ – ХХІ стагоддзяў звярталіся часцей да перыяду княжання Вітаўта і Ягайлы, паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, Слуцкага паўстання. Аўтары выкарыстоўвалі сюжэты з ХХ ст., як ужо мінулай гістарычнай эпохі, асэнсоўвалі сумныя падзеі 1930-х гг., калі ў краіне адбываліся масавыя рэпрэсіі" [2, с. 35].

На сённяшні час адной з самых распаўсюджаных тэм з'яўляецца праблема светапогляду Ф.Скарыны і накіраванасці яго дзейнасці – гэта па сутнасці частка глабальнай праблемы станаўлення і развіцця беларускага народа.

Пачынаючы з другой паловы 50-х гадоў абвастрылася ўвага літаратуры і мастацтва да мінулага. Прычынай гэтаму паслужыла жаданне пісьменнікаў глыбей зведаць гісторыю свайго народа, вывесці вытокі сённяшняга дня з ўчарашняга. Сярод самых знакамітых беларускіх дзеячаў культуры можна вызначыць вядомых І.Мележа, К.Чорнага, У.Караткевіча В.Іпатаву, У.Арлова, Л.Дайнеку і інш. Яны асвятлялі розныя часы гісторыі з яе адметнымі гістарычнымі асобамі, якія вядомы нам.

Адной з адметных асоб эпохі Рэнесансу з'яўляецца Францыск Скарына. Літаратурна-мастацкае адлюстраванне дзейнасці Ф.Скарыны і яго эпохі пачалося ў перыяд паскоранага развіцця беларускай літаратуры, росту нацыянальнай самасвядомасці і прагрэсіўнай грамадска-палітычнай думкі – ў канцы XIX – пач. XX стст.

Рэалістычнае, гістарычна праўдзівае і рамантычна-ўзнёслае адлюстраванне вобраза Скарыны і яго эпохі пачалося ў творчасці М.Багдановіча – аднаго з першых даследчыкаў беларускага Адраджэння XVI ст., аўтара манаграфічнага артыкула пра Францыска Скарыну, які быў створаны ў 1913 годзе, але да нашага часу не захаваўся. Менавіта ў М.Багдановіча ёсць цыкл вершаў("Старая Беларусь", 1912 г.), прысвечаных сярэдневяковым асветнікам.

Першым эпічным творам, які прысвечаны асобе, творчасці і дзейнасі Францыска Скарыны, з'яўляецца аповесць С.Хурсіка "Францішак Скарына". У аснове сюжэту гістарычны факт – пажар у Вільні летам 1530. Герой аповесці Скарына разам са сваімі сябрамі – бурмістрам Я.Бабічам, друкарамі Данілам і Цімохам – змагаецца за палітычную незалежнасць і культурную самабытнасць Беларусі. Паводле аўтарскай канцэпцыі, Скарына быў народным асветнікам, які не цікавіўся рэлігійнымі пытаннямі, адмаўляў планы царкоўнай уніі, выкрываў антынародны характар лютэранства і каталіцызму, хоць фармальна сам перайшоў у каталіцтва, каб вучыцца ў Кракаўскім універсітэце. У творы Францыск Скарына паўстае як і ў большасці твораў, гуманістам, чалавекам, які змагаецца за правы сялян (імкнецца вызваліць іх ад прыгнёту, дазволіць атрымліваць адукацыю і г.д.). У творы Хурсіка Францыск Скарына губляе не толькі працу свайго жыцця, але і фармальна сваё жыццё – ў падпаленай кнігадрукарні, разам з кнігамі, загінулі яго дзеці. Але гэта не спыняе Францыска Скарыну ў яго творчасці, у яго мэтанакіраванай працы. Разам з памочнікам Данілам ідзе ў горад, каб памагаць бедным пагарэльцам.

Цікавасць да спадчыны Францыска Скарыны і яго непаўторнага чалавечага лёсу на высокім мастацкім узроўні выявілася ў паэзіі 1950-1960-х гадоў. Адметнымі творамі гэтага часу, прысвечаныя не толькі Скарыне, а і яму падобным асветнікам Сярэднявечча, можна лічыць верш С.Грахоўскага “Палачанка”(1959), С.Шушкевіч “Скарына ў Празе” (1962), Н.Гілевіч “Мара Скарыны” (1965).

Адным са знакамітых праяўленняў вобраза Францыска Скарыны ў сусачнай беларускай прозе з’яўляецца твор У.Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”, дзе аўтар перадае ў зразумелай форме, сцісла і паслядоўна ўсю гісторыю Беларусі, акрэсліваючы асноўныя моманты з галоўнымі асобамі сва

йго часу. Сярод асветнікаў, пра якія ідзе размова ў кнізе, чытач сустракае Францыска Скарыну, Еўфрасінню Полацкую, Кірыла Тураўскага і інш.

Услед за У.Караткевічам асоба Францыска Скарыны яскрава выявілася ў вершах В.Віткі (паэма “Беларуская калыханка”), Я.Сіпакова “Кантрабанда” (з цыкла “Веча славянскіх балад”), А.Лойкі “Скарына – каралеўскі садоўнік на Градчанах”, П.Марціновіча “Скарына”, М.Арочкі “Судны дзень Скарыны” і шмат іншых.

Вялікая цікавасць да жыццёвага шляху выбітной асобы эпохі Адраджэння і Сярэднявечча, гуманіста, асветніка і першадрукара спадзвігнула А.Лойку ўзяцца за напісанне вялікага, па аб’ёме, і актуальнага па тэматыцы твора — рамана-эсэ “Францыск Скарына, альбо Сонца Маладзіковае”. А пасля пісаў: “У літаратуры асноўнае, на мой погляд, пачуць час у яго адметнасці, я б сказаў, вібрацыі, трымценні, пачуць музыку душы і мыслі чалавека ў пэўным часе. “Можа даследчыкі старабеларускай літаратуры менш адчулі душу Фрнцыска Скарыны як паэычную, трымцліва-музычную, узнёсла-літургічную. Адчуць яе і асабліва нейкім чынам замацаваць у форме – вось мая была задача <…>” [4, с.463].

Скарынінская тэма стала ўжо традыцыйнай у творах беларускіх паэтаў. З кожным годам павялічваецца цікавасць да гісторыі, да Сярэдневяковых асоб-асветнікаў, што не з'яўляецца незразумелай і невытлумачальнай тэндэнцыяй.

Вывучэнне спадчыны Ф.Скарыны пачалося ў канцы 18 стагоддзя. Вялікі ўклад у даследаванне жыцця і дзейнасці вялікага беларускага асветніка, яго выданняў, літаратурнай творчасці, поглядаў зрабілі рускія і беларускія скарыназнаўцы, асабліва У.Пічэта, П.Уладзіміраў, А.Фралоўскі, М.Шчакаціхін, а ў наш час – М.Алексютовіч, У.Анічэнка, А.Булыка, Г.Галенчанка, В.Дарашкевіч, А.Жураўскі, У.Калеснік, У.Конан, А.Коршунаў, Ю.Лабынцаў, В.Чамярыцкі і інш. Усяго Скарыніяна налічвае каля 4 тысяч розных публікацый, у тым ліку каля 100 кніг і брашур. Пра Ф.Скарыну даследчыкі адшукалі і апублікавалі больш за 50 дакументаў на лацінскай, чэшскай, старабеларускай мовах. Захавалася каля 320 экзэмпляраў выданняў Скарыны і іх фрагментаў, якія зберагаюцца ў розных бібліятэках, архівах і музеях свету, найбольш у Маскве і Санкт-Пецярбургу.

Найбольшую ўвагу першых савецкіх даследчыкаў беларускай культуры прыцягвала дзейнасць Ф.Скарыны. Як ацэньвае дзейнасць Ф.Скарыны ў сваім артыкуле М.Піятуховіч, што "дзейнасць Францішка Скарыны ў цэлым, дык трэба сказаць, што яна мае вялізарнае культурна-нацыянальнае значэнне. Яна служыць паказальнікам высокага культурнага ўзроўню, на якім стаяла Беларусь у XVI сталецці: храналагічна "Біблія" Фр.Скарыны займае трэцяе месца (першая нямецкая друкаваная "Біблія" з'явілася ў 1445 годзе, чэшская – у 1488, наша беларуская – у 1517—1519 годзе" [7, с.175]. Таксама, у гэтым жа артыкуле, вызначаецца стаўленне самаго даследчыка і асвятленне асновы дзейнасці Ф.Скарыны: "Францішак Скарына –сын свайго часу. Уся яго дзейнасць мае пэўную рэлігійную падставу. У сваіх прадмовах ён выяўляе схаластычныя погляды Сярэднявечча. Біблія – для яго крыніца ўсялякае мудрасці, крыніца ўсіх навук" [7, с.176].

Істотны ўклад у даследаванне светапогляду Ф.Скарыны ўнёс У.Пічэта. Ён характарызуе Францыска Скарыну як знакамітага доктара, гуманіста, дзейнасць якога – адданае служэнне свайму народу. [6, с. 317].

Вялікую ўвагу Ф.Скарыне ўдзялаяў Я.Карскі. У кнізе "Беларусы" аўтар адвёў шмат месца значнай асобе эпохі Адраджэння. Карскі высока ставіў дзейнасць Скарыны і лічыў, што ўсе яго выданні Бібліі – выключная ў многіх адносінах з'ява "заходнерускай" культуры. Дзейнасць Францыска Скарыны вельмі імпанавала Я.Карскаму, яго няўрымслівасць, незвычайная маштабнасць яго асветніцкай дзейнасці на карысць роднага народа. У асобе Ф.Скарыны, піша ён, "мы бачым у асобе Скарыны адукаванага чалавека свайго часу, які ні колькі не ўступае тагачасным заходнееўрапейскім дзеячам ні па сваім розуме, ні па энергіі і па сваіх высокіх задумах. <…> Не знаходзячы на радзіме вышэйшай навукі, ён падарожнічае па выбітных тагачасных заходнееўрапейскіх універсітэтах, дасягае вышэйшых ведаў і выкарыстоўвае іх на карысць свайму народу <…>" [3, с. 26].

М.А.Алексютовіч прысвяціў сваю працу харктарыстыцы грамадскіх і філасофскіх поглядаў выдатнага прадстаўнік прагрэсіўнай беларускай культуры пачатку XVI ст. – Францыску Скарыне. Але, як вядома, што імя Францыск (у дачыненні да Скарыны) мае розныя варыянты выкарыстання і ўсё залежыць ад погляду даследчыка, або пісьменніка. Так, М.А.Алексютовіч называе першадрукара не распаўсюджаным імем Францыск, а пачынае свой аповед пра жыццё і дзейнасць асветніка імем Геогій Францыск Скарына. Даследчык сцвярджае пра светапогляд Ф.Скарыны, што той, па сваіх філасофскіх погядах, "быў ідэалістам. У сувязі з сацыяльна-гістарычнымі прычынамі ён не мог тады вызваліцца з-пад уплыву тэалогіі і рэлігіі. Як і яго сучаснікі, ён глядзеў на свет вачыма веруючага чалавека, разглядаў біблію як крыніцу ведаў і мудрасці" [1, с. 75]. Не толькі светапогляд цікавіў даследчыка, але таксама на старонках работы можна прасачыць адносіны і ацэнку дзейнасці Ф.Скарыны: "Скарына быў першым беларускім вучоным-гуманістам у самым шырокім і

лепшым сэнсе гэтага слова. Яго погляды, ідэі прасякнуты любоўю да навукі і асветы, верай у сілу чалавечага розуму, глыбокай павагай да простых людзей, у якіх ён імкнуўся выхаваць высокія маральныя якасці” [1, с. 76]. Чалавечае шчасце, на думку даследчыка, у разуменні Ф.Скарыны, заключалася ў “занятках навукамі, у пастаянным разумовым і маральным удасканальванні” [1, с. 94].

Увогуле даследаваннем творчасці Ф.Скарыны займаліся многія літаратуразнаўцы, з іх Н.Ю.Бярозкіна, Г.Я.Галенчанка, У.Ф.Конан, С.А.Падокшын і інш. Усе яны даследавалі літаратурную спадчыну першадрукара. С.А.Падокшын высвятляў асаблівасці філасофскай думкі Ф.Скарыны і яго сучаснікаў. Ён адзначаў, што “светапогляд Скарыны – узор пераважна каштоўнаснага, духоўна-практычнага асваення рэчаіснасці <…>” [5, с. 122]. Галоўным прынцыпам светапогляду Францыска Скарыны, даследчык лічыць “адраджэнчы антрапацэнтрызм, г.зн. вылучэнне на першы план праблемы зямнога прадвызначэння чалавека” [5, с. 123]. Таксама С.А.Падокшын вылучае асноўныя мэты, якія ўдалося ажыццявіць Ф.Скарыну падчас сваёй дзейнасці, а менавіта Ф.Скарына “значна пашырыў межы духоўна-маральнай свабоды чалавека, абвясціў права індывіда на адносна незалежнае вытлумачэнне біблейскіх тэкстаў <…>, пастуліраваў неабмежаванае права чалавека на пазнанне і творчасць <…>” [5, с. 123].

Францыск Скарына – вялікі патрыёт, верны і адданы сын свайго народа. Нягледзячы на тое што як асоба Скарына склаўся пераважна ў абстаноўцы заходнееўрапейскай культуры, ён не парваў сувязі з радзімай, не страціў нацыянальнай адметнасці, а ўсе сілы і веды, усю сваю энергію аддаў служэнню свайму народу, звярнуў на карысць народа. Не дзіўна, што патрыятызм ён узвёў на ўзровень вышэйшых грамадзянска-этычных каштоўнасцей.

Праблема светапогляду Францыска Скарыны і накіраванасці яго дзейнасці – гэта па сутнасці частка глабальнай праблемы станаўлення і развіцця беларускага народа як свядомага суб’екта гісторыі, фарміравання

яго культуры, нацыянальнай самасвядомасці; гэта праблема шматвяковай барацьбы беларускага народа за сваё сацыяльнае вызваленне, нацыянальнае існаванне і дзяржаўную самастойнасць.

## Літаратура


1. Алексютовіч, М.А. Скарына,  і яго дзейнасць і светапогляд / М.А. Алексютовіч; пад рэд. . — Мінск: АН БССР, 1958. — 147 с. (2)
2. Драбеня, Ф.В. Навейшая беларуская драматургія пра праблемы сучаснасці / Ф.В. Драбеня // БДУ— Мінск: Вып.9, 2011. 128 с.— С. 30-34. (7)
3. Карскі, Я.Ф. Беларусы / Я.Ф. Карскі. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. — 637 с. (8)
4. Лойка А.А. Дрэва жыцця: Кніга аднаго лёсу / А.А.Лойка. – Слонім: ГАУПП “Слонім. друк.” , 2004. – 624 с. (3)
5. Падокшын С.А. Філасофская думка Эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. – Мн., 1990. – 285 с. (12)
6. Пічэта, У. Scoriniana (1776—1926) / У.Пічэта // Чатырохсотлеце беларускага друку / пад рэд. А.Смоліча – Мінск: 1926. – 355 с. (14)
7. Піятуховіч, М. Францішак Скарына і яго літаратурная дзейнасць / М. Піятуховіч // Чатырохсотлеце беларускага друку / пад рэд. А.Смоліча — Мінск: 1926. — 355 с. (15)